■ Доктар адкажа

НЕ ТОЙ РЫТМ У СЭРЦА

«Сёлета мне паставілі дыягназ: арытмія... Хацелася б больш даведацца пра гэта захворванне, як яго трэба лячыць...

З павагай,
Фёдар Мацвеевіч,
Бярозаўскі раён».

— У здаровага чалавека перабоі ў рабоце сэрца можа справакаваць фізічная нагрузка, эмацыянальнае ўзрушэнне, празмерная трапеза, цеснае адзенне, укусы насякомых, некаторыя лекі і стрэс, — тлумачыць **урач-герыятр 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Уладзімір ЛАПІЦКІ.** — Частата рытму ў большасці здаровых дарослых у спакоі складае 60-75 удараў у хвіліну, і парушэнне рытму ў такога чалавека мае, кажучы прафесійнай мовай спецыялістаў, дабраякасны характар. Правакуючым фактарам узнікнення арытмій з'яўляецца ўжыванне алкаголю, курэнне. Высокая рызыка арытмій і ў хворых на цукровы дыябет, асабліва ў спалучэнні з атлусценнем і павышаным артэрыяльным ціскам. Арытміі могуць узнікаць і з-за перадменструальнага сіндрому ў жанчын.

У той жа час парушэнне сардэчнага рытму — адно з найбольш частых і значных ускладненняў самых розных захворванняў. Арытміі — парушэнні частаты, рытмічнасці і паслядоўнасці скарачэнняў сэрца — узнікаюць як пры захворваннях сэрца, так і пры сардэчнай паталогіі, калі праводная сістэма сэрца падвяргаецца нервова-рэфлекторным уздзеянням, пры парушэнні ў арганізме водна-электралітнага і кіслотна-шчолачнага балансу, пры гарманальным дысбалансе. Тыя ці іншыя парушэнні сардэчнага рытму сустракаюцца ў кожнага трэцяга пацыента, які пакутуе на хваробы сэрца. Такія пацыенты пастаянна маюць патрэбу ў спецыялізаванай дапамозе кардыёлага. Статыстыка хвароб паказвае, што на долю арытмій прыпадае да 15 працэнтаў ад усіх хвароб сэрца.

НАЙБОЛЬШ ЧАСТА СУСТРАКАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ВІДЫ АРЫТМІІ:

Сінусовая тахікардыя — сінусовы рытм з частатой звыш 70 удараў за хвіліну. У здаровых людзей яна ўзнікае пры фізічнай нагрузцы і эмацыйным узрушэнні. Часта бывае праявай вегета-сасудзістай дыстаніі, у гэтым выпадку яна заўважна змяншаецца пры затрымцы дыхання. Больш стойкая сінусовая тахікардыя здараецца пры павышэнні тэмпературы цела, тырэатаксікозе, міякардытах, сардэчнай недастатковасці, анеміі. Хворыя пры гэтым могуць адчуваць сэрцабіццё.

Сінусовая брадыкардыя — сінусовы рытм з частатой менш за 55 удараў у хвіліну. Нярэдка адзначаецца ў здаровых, асабліва ў фізічна трэніраваных асоб (у спакоі, сне), можа быць праявай нейрацыркуляторнай дыстаніі, а таксама ўзнікаць пры інфаркце міякарда, сіндроме слабасці сінусовага вузла, пры павышэнні ўнутрычарапнога ціску, зніжэнні функцыі шчытападобнай залозы (гіпатырэёз), пры некаторых вірусных захворваннях, пад уплывам шэрагу лекаў. Брадыкардыя можа праяўляцца непрыемнымі адчуваннямі ў сэрцы.

Экстрасісталы — заўчасныя скарачэнні сэрца. Гэта самае частае парушэнне рытму, якое назіраецца больш чым у 60 працэнтаў практычна здаровых людзей паводле звестак сутачнай рэгістрацыі даных электракардыяграфіі. Могуць суправаджаць любое захворванне сэрца, а ў палове выпадкаў не звязаны з гэтым наогул, адлюстроўваюць уплыў на сэрца вегетатыўных і псіхаэмацыянальных парушэнняў, а таксама балансу электралітаў у арганізме, лекавага лячэння, алкаголю, тытуню, узбуджальных рэчываў. Рэфлекторна ўзнікаюць пры любой несардэчнай паталогіі.

Хворыя могуць і не адчуваць экстрасістал або адчуваць узмоцнены штуршок у сэрцы ці яго заміранне. Экстрасісталы, якія рэдка здараюцца пры здаровым сэрцы, не істотныя, але іх пачашчэнне часам указвае на абвастрэнне той жа ішэмічнай хваробы сэрца, міякардыту, або перадазіроўку сардэчных гліказідаў. Экстрасісталы могуць папярэднічаць больш сур'ёзным парушэнням рытму, у тым ліку параксізмальнай тахікардыі і мігальнай арытміі.

Параксізмальная тахікардыя — прыступы пачашчаных сэрцабіццяў з раптоўным пачаткам і раптоўным завяршэннем. Прычыны і механізмы развіцця — як пры экстрасісталіі. Параксізм тахікардыі адчуваецца як узмоцненае сэрцабіццё, працягваецца ад некалькіх секундаў да некалькіх дзён. Працяглыя прыступы могуць суправаджацца слабасцю, стратай прытомнасці, непрыемнымі адчуваннямі ў сэрцы, стэнакардыяй, нарастаннем сардэчнай недастатковасці. Характэрны правільны, але часты сардэчны рытм, які можа вагацца ад 140 да 240 удараў у хвіліну. Такі стан можа ўзнікаць раптоўна, хворы адчувае слабасць, павышанае потаадздзяленне.

Мігальная арытмія — хаатычнае скарачэнне мышачных валокнаў, пры якім не адбываецца поўнага скарачэння перадсэрдзяў. Можа ўзнікаць у выніку парокаў сэрца, парушэння работы шчытападобнай залозы, пры алкагалізме. Хворы скардзіцца на трапятанні і боль у сэрцы, пакутуе ад задышкі. Міганне перадсэрдзяў могуць справакаваць цяжкія сардэчныя захворванні, электрычныя траўмы і перадазіроўкі лекамі. Пры гэтым можа ўзнікнуць і раптоўнае спыненне сэрца, адсутнасць прытомнасці і пульсу, расшырэнне зрэнак, хрыплае дыханне, сутаргі.

Блакады сэрца — гэта парушэнне правядзення імпульсу з-за анатамічнага або функцыянальнага пашкоджання праводных шляхоў сэрца. Самай частай прычынай блакад з'яўляецца ішэмічная хвароба сэрца, а наогул блакады могуць суправаджаць любыя сардэчныя захворванні: артэрыяльную гіпертанію, парокі сэрца, запаленчыя захворванні сардэчнай мышцы. Вылучаюць таксама парушэнні праводнасці пад уплывам лекаў. Парушэнне праводнасці функцыянальнага паходжання развіваецца пры захворваннях з павышэннем тонусу блукаючага нерва і ў спартсменаў.

Пры III ступені блакады ніводны імпульс з аднаго аддзела не пераводзіцца ў іншы. Гэта называецца поўнай блакадай сэрца. Сардэчны рытм — менш за 40 удараў у хвіліну, магчыма галавакружэнне, памутненне ў вачах, кароткачасовая страта прытомнасці. Блакады I ступені могуць суправаджацца кароткачасовым галавакружэннем, пачашчэннем пульсу, з'яўленнем экстрасісталы. Звычайна хворыя ні на што не скардзяцца.

Прыкметай захворвання з'яўляецца перыядычнае запавольванне або спыненне пульсу. Пры гэтым часта назіраюцца сутаргі і страта прытомнасці. Пры поўнай блакадзе сэрца можа развівацца сардэчная недастатковасць, якая можа скончыцца раптоўнай смерцю. Пры поўнай блакадзе сэрца адзінае выйсце — імплантацыя штучнага вадзіцеля рытму.

Дакладнае апісанне сімптомаў часта дапамагае паставіць папярэдні дыягназ і вызначыць цяжкасць арытміі. Пацыента, які скардзіцца на сэрцабіццё, урач просіць падрабязна расказаць пра сардэчныя скарачэнні: хуткія ці павольныя, рэгулярныя або няправільныя, кароткія ці працяглыя, ці адчуваецца пры гэтым галавакружэнне, страта прытомнасці, ці суправаджаецца сэрцабіццё болем у грудзях, задышкай. Урач павінен ведаць, сэрцабіццё ўзнікае ў спакоі ці толькі падчас напружанай або нязвыклай фізічнай нагрузкі, раптоўна ці паступова пачынаецца і заканчваецца такі стан.

ЭЛЕКТРАКАРДЫЯГРАМЫ МОЖА БЫЦЬ МАЛА

Каб вызначыць дакладную прычыну стану, неабходна абследавацца. Асноўны метад — электракардыяграфія, якая забяспечвае графічны запіс электрычнай актыўнасці сэрца пры арытміі. Аднак электракардыяграма паказвае сардэчны рытм толькі за вельмі кароткі прамежак часу, а прыступы арытміі часта непрацяглыя. Больш інфармацыі можа забяспечыць пераносны манітор, які трэба насіць на працягу 24 гадзін. Ён рэгіструе арытміі, якія ўзнікаюць на працягу звычайнага дня. Таксама неабходна весці дзённік сімптомаў на працягу 24 гадзін. Пры падазрэнні на арытмію, якая можа пагражаць жыццю, для абследавання шпіталізуюць.

СУПРАЦЬАРЫТМІЧНЫЯ ПРЭПАРАТЫ І НЕ ТОЛЬКІ

У большасці выпадкаў прызначаюцца супрацьарытмічныя прэпараты, адны з якіх павялічваюць сардэчную праводнасць, іншыя — змяншаюць. Для лячэння шырока выкарыстоўваюцца мінеральныя і вітамінныя комплексы, а таксама розныя рэфлекторныя ўздзеянні, якія змяншаюць узбуджальны ўплыў нервовай сістэмы на сэрца. Акрамя таго, для лячэння арытміі ўстанаўліваюцца кардыястымулятары, якія дапамагаюць міякарду аднавіць нармальны рытм. Часам прызначаюцца фізіятэрапеўтычныя працэдуры. Эфектыўнасць лячэння арытміі поўнасцю залежыць ад правільнай пастаноўкі дыягназу і своечасовага звароту да ўрача.

ЭФЕКТЫЎНАЯ ПРАФІЛАКТЫКА САРДЭЧНА-САСУДЗІСТЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ І ІХ УСКЛАДНЕННЯЎ

1. Кантралюйце артэрыяльны ціск. Норма — не вышэй за 140/90 мм рт. сл.

2. Кантралюйце ўзровень халестэрыну і глюкозы.

3. Харчуйцеся правільна.

4. Зніжайце лішнюю вагу.

5. Спіце не менш за 8 гадзін.

6. Займайцеся фізкультурай: нават крыху — лепш, чым нічога.

7. Не курыце.

8. Абмяжоўвайце алкаголь.

9. Захоўвайце псіхалагічную раўнавагу.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению Открытого акционерного общества «Березинский райагросервис» (продавец)
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ

здания специализированного для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – ангар, общей площадью 1016,9 кв.м (инв. № 611/С-37698), расположенного на земельном участке, площадью **2,1630 га** (передан в аренду) с кадастровым номером 620450100001003180, расположенного по адресу: **Минская область, Березинский район, г. Березино, ул. Зеленая, 18.**

Начальная цена с НДС – 980 400 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (98 040 000 бел. руб.), перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **22.08.2013 в 14:00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.08.2013 до 12:00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

Считать недействительным утерянный студенческий билет Кролик Анны Васильевны, учащейся Минского торгового колледжа «Белкоопсоюз».

Считать недействительными страховые свидетельства ФСООО «Белкоопстрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 2807126, № 0630618.

30 июля 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лунинецлес».

Повестка дня:

1. О внесении изменений в решение собрания.
2. О вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии.
3. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 23.07.2013 г. (с 10.00 до 13.00) по месту нахождения общества.

УНН 200251040 Совет директоров.

ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПРОВОДИТ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации
1	д. Кузевичи, уч. 1, кдастровый № 623284502101000054	0,1558 га	Подъездные пути удовлетворительные	9 569 000	1 913 800	3 012 890
2	д. Селище, уч. № 11, кадастровый № 623284505601000057	0,1500 га	Подъездные пути удовлетворительные	12 154 200	2 430 850	3 800 050
3	д. Селище, уч. № 12, кадастровый № 623284505601000056	0,1500 га	Подъездные пути удовлетворительные	12 154 200	2 430 850	3 800 050
4	д. Медухово, уч. № 20, кадастровый № 623284503601000072	0,1500 га	Подъездные пути удовлетворительные	14 223 000	2 844 600	3 800 050
5	д. Красный Бор, уч. № 5 кадастровый № 623280805601000037	0,2035 га	Подъездные пути удовлетворительные	13 929 580	2 785 900	3 800 050

Аукцион провдится 22.08.2013 года в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области, здание Гайненского исполнительного комитета. Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, до 17 августа 2013 года по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области.

Задаток перечисляется на р/с № 3600619021104 в ЦБУ 611 филиале 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ОКПО 04431493, УНН 600181697, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Контактные телефоны: 801774 56436, 56498.

■ Ранняя дыягностыка

КАЛІ НЫРКІ ДАЮЦЬ ЗБОЙ...

Павышэнне ўзроўню глюкозы прыводзіць да мікрасасудзістых і сасудзістых парушэнняў, у выніку чаго ўзнікае сардэчна-сасудзістая недастатковасць, інфаркты і інсульты. Прычына ўзнікнення такіх парушэнняў — не толькі ў спадчыннай схільнасці, але і ў ладзе жыцця. Мала руху, фізічнай актыўнасці, шкодныя звычкі, харчаванне з вялікай колькасцю лёгказасваяльных вугляводаў, якія арганізм назапашвае ў выглядзе тлушчавых адкладанняў, знаходжанне ў пастаянным стрэсе — усё гэта парушае нармальны абмен рэчываў і спрыяе развіццю паталогіі, а менавіта метабалічнаму сіндрому, які закранае жыццёва важныя органы і сістэмы. Метабалічны сіндром — гэта цэлы комплекс метабалічных, гарманальных і клінічных парушэнняў, якія з'яўляюцца фактарамі рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістай паталогіі, у аснове якой хаваецца інсулінарэзістэнтнасць і кампенсаторная гіперінсулінемія.

Першым цяжкім вынікам метабалічнага сіндрому з'яўляецца пашкоджанне нырак, расказвае **ўрач клініка-дыягнастычнай лабараторыі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Ірына ЗАХАРЭВІЧ**. Ныркі — гэта натуральныя фільтры нашага арганізма, якія выдаляюць таксічныя прадукты жыццядзейнасці і перашкаджаюць развіццю самаатручэння. Пры нармальным іх функцыянаванні праз ныркавы бар'ер праходзяць толькі шкодныя, адпрацаваныя рэчывы, а неабходныя — глюкоза і большасць бялкоў — застаюцца ў арганізме. Пры развіцці ж ныркавай недастатковасці праз ныркавыя фільтры пачынаюць выдзяляцца і гэтыя прадукты, і тады яны выяўляюцца ў мачы. Невялікая колькасць бялкоў у мачы можа выяўляцца і ў норме, аднак такія цяжкія высокамалекулярныя бялкі, як альбумін, які з'яўляецца асноўным бялком нашага арганізма, пры нармальнай рабоце нырак у мачы не вызначаецца. **Калі ж назіраецца працэс, які называецца мікраальбумінурыяй — нязначнае выдзяленне альбуміну з мачой, то гэта ўказвае на пашкоджанне нырак, што пры адсутнасці лячэння прыводзіць да развіцця ныркавай недастатковасці.**

Цукровы дыябет і гіпертанічная хвароба — найбольш частыя прычыны развіцця ныркавай недастатковасці, і іх значэнне толькі ўзрастае. Таму вельмі важна выявіць парушэнні як мага раней. Дапамагчы ў гэтым можа просты і даступны тэст — аналіз на наяўнасць мікраальбумінурыі.

Ёсць звесткі, што ўзровень мікраальбумінурыі звязаны з ростам сардэчна-сасудзістай паталогіі і смяротнасці, прычым нават нязначнае павелічэнне выдзялення альбуміну прама прапарцыянальнае павелічэнню рызыкі ўзнікнення сасудзістых ускладненняў. Таму гэты паказчык прызнаны незалежным фактарам рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя рэкамендуюць штогод правяраць выдзяленне альбуміну з мачой у хворых на цукровы дыябет 1 тыпу, старэйшых за 12-15 гадоў, праз 5 гадоў пасля пачатку захворвання і ва ўсіх хворых на цукровы дыябет 2 тыпу, не старэйшых за 70 гадоў. Цяпер вядома, што мікраальбумінурыя сустракаецца не толькі пры дыябетычным пашкоджанні нырак, але з'яўляецца раннім маркёрам сардэчна-сасудзістай рызыкі ў пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, незалежна ад наяўнасці цукровага дыябету або паталогіі нырак.

Лабараторная база цэнтральных і нават некаторых гарадскіх паліклінік, а таксама клініка-дыягнастычных лабараторый стацыянараў валодае магчымасцю для правядзення простага тэсту, а метады выяўлення мікраальбумінурыі адчувальныя і надзейныя.

Калі вы вырашылі праверыцца на наяўнасць мікраальбумінурыі, варта памятаць, што яна ўзрастае пры ўжыванні бялковай ежы, пасля цяжкай фізічнай нагрузкі і ў некаторых іншых сітуацыях, залежыць ад полу і расы, спадарожных захворванняў. Акрамя таго, дыягнастычнае значэнне маюць не аднаразовае выяўленне, а некалькі аналізаў, выкананых на працягу 3-6 месяцаў. Гэта неабходна для ацэнкі ступені рызыкі.

Каму трэба прайсці тэст на мікраальбумінурыю?

✓Хворым на цукровы дыябет 1 тыпу — не радзей за 1 раз на год праз 5 гадоў ад пачатку захворвання і не радзей за 1 раз на год з моманту ўстанаўлення дыягназу ва ўзросце да 12 гадоў.

✓Хворым на цукровы дыябет 2 тыпу не радзей за 1 раз на год з моманту пастаноўкі дыягназу.

✓Хворым са спадчыннымі формамі дысліпідэмій, ішэмічнай хваробай сэрца, артэрыяльнай гіпертэнзіяй, пацыентам з парушэннем адчувальнасці да глюкозы.

✓Хворым з гламеруланефрытамі.

Своечасова прызначанае лячэнне дапамагае зменшыць рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых ускладненняў.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Бацькі — дзецям

НАЗВАЦЬ РЭЧЫ СВАІМІ ІМЁНАМІ

Што, калі і як гаварыць дзіцяці пра «гэта»? Спачатку трэба ведаць, як не трэба расказваць дзіцяці пра секс. Па-першае, не трэба маўчаць, маўляў, «табе яшчэ рана», «падрасцеш — даведаешся», «адкуль ты нахапаўся такіх пытанняў?».

Па-другое, не трэба саромецца і чырванець, нібыта дзіця запытала пра нешта непрыстойнае. Тут не павінна быць ні вялікіх вачэй, ні недарэчных смяшкоў, ні спецыфічнага тону. Па-трэцяе, не трэба рабіць з размовы гадзінную лекцыю, дастаткова сказаць самае важнае на працягу 3-7 хвілін.

Як жа трэба? Ды проста і сумленна. Як пра будзільнік або электрычны ток, адзначае **ўрач-валеолаг аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ганна РОДЗІЧ**.

Проста — значыць у такой форме і колькасці, якія здольна засвоіць дзіця.

Сумленна — значыць, нічога не выдумляючы і не блытаючы. Калі ёсць небяспека нешта пераблытаць, лепей прапанаваць пачытаць у дакладнай крыніцы або пачытаць самому і расказаць без недакладнасцяў. У такой размове не павінна быць лішняга напружання. Другая і наступныя размовы на тэму сексу будуць давацца прасцей і насіць толькі ўдакладняльны характар.

Бацькі павінны інфармаваць дзіця — карэктна і па магчымасці поўна. З дапамогай кніг, схем, вучэбных фільмаў. Але нельга «соваць нос» у сексуальнае жыццё дзіцяці. Псіхолагі лічаць такія паводзіны шкоднымі, паколькі пагражаюць нядобрымі наступствамі. Калі ў дзяцінстве бацькі пранікаюць, груба ўмешваюцца ў сексуальнае жыццё дзіцяці (напрыклад, караюць за мастурбацыю, крытыкуюць ці высмейваюць закаханасці, негатыўна выказваюцца пра палавое развіццё, не кажучы пра знешні выгляд, і г.д.), тады ў больш познім узросце ў яго з'явяцца сур'ёзныя псіхалагічныя праблемы ў інтымным жыцці.

2-4 гады. Можна расказаць пра цяжарнасць, сказаць, што дзіця атрымалася з мамінай і татавай клетачак. Можна расказаць «казку на ноч» пра тое, як дзіця расло ў мамы ў жываце, пачытаць малому энцыклапедыю, паказаць карцінкі, дзе відаць, як дзіця сядзіць у жывоціку, і чым адрозніваюцца дзяўчынка і хлопчык. Зразумела, геніталіі дзяцей мы называем пяшчотнымі «дзіцячымі» імёнамі. Аднак калі ў будучыні мы збіраемся расказаць пра секс, то нядрэнна ўдакладніць, што жаночыя і мужчынскія органы маюць свае «сур'ёзныя назвы». Не трэба казаць, што ў палавых органаў ёсць свая асаблівая місія — трэба проста ўказаць на адрозненні палоў і даць геніталіям назвы.

4-6 гадоў. Расказваючы пра новыя, больш складаныя рэчы, адказвайце проста і коратка — не трэба ўпіхваць у дзіця цэлы комплекс інфармацыі. Псіхолагі даведваюцца ад дзяцей, што нярэдка бацькі расказваюць ім нават тое, пра што тыя і не думалі пытацца. Дайце маленькую порцыю карэктнай інфармацыі і прасачыце за рэакцыяй. Калі дзіця пераключылася на нешта іншае, то пакіньце яго ў спакоі. Калі дзіця засвоіла раней сказанае і задае новыя пытанні, дайце наступную порцыю інфармацыі.

6-9 гадоў. Дзіця звычайна даведваецца ўласна пра секс і кантрацэпцыю. Расказы пра сперматазоіды і яйцаклеткі, фалопіевы трубы і замацаванне зародку на сценцы маткі суправаджайце карцінкамі з энцыклапедыі або малюйце самі на паперы. Скажыце так: «Але не заўсёды секс вядзе да злучэння палавых клетак і з'яўлення дзіцяці. Людзі навучыліся рабіць так, каб мужчынская і жаночая клеткі не злучаліся, калі мужчына і жанчына не хочуць цяпер дзяцей. Напрыклад, мужчына можа надзяваць на пеніс спецыяльны гумавы мяшэчак, прэзерватыў, і тады ўсе яго сперматазоіды застануцца ў гэтым мяшэчку і не трапяць у матулін жывот. Або жанчына можа піць спецыяльныя таблеткі, якія не даюць злучацца мужчынскім і жаночым клеткам. Гэта называецца кантрацэптыя. Сёння ёсць шмат сродкаў і спосабаў кантрацэпцыі».

Калі раней дзіця ведала, што немаўляты з'яўляюцца са «спецыяльнай адтуліны» пад жыватом, то цяпер самы час удакладніць, што немаўляты выходзяць таксама з похвы.

Важна! Патлумачце сыну ці дачцэ, што бываюць «дрэнныя» дарослыя, якія жадаюць не проста сябраваць з дзецьмі, а займацца з імі сексам, для свайго задавальнення. Дайце зразумець, што цела любога чалавека — яго ўласнасць. «Давай дамовімся: калі любы дарослы, нават самы блізкі, прапануе табе зрабіць штосьці няправільнае ці непрыемнае, некуды пайсці, распрануцца, паказаць сябе — не рабі гэтага. Скажы «не» і пакліч каго-небудзь на дапамогу, скажы гучна: «Гэты дзядзька дакранаецца да мяне!». І абавязкова раскажы пра гэта мне». Навучыце дзіця не браць у чужых цукеркі або цацкі і нікуды не хадзіць. «Гэта могуць быць дрэнныя людзі, хоць яны заўсёды прыкідваюцца добрымі».

Падлеткавы ўзрост — час пытанняў адносна таго, што адбываецца з арганізмам. Неабходна расказаць хлопчыкам пра змены голасу, начныя палюцыі і міжвольныя эрэкцыі, дзяўчынкам — пра рост малочнай залозы, змены фігуры, менструацыі. Адзначыць пры гэтым, што псіхалагічны дыскамфорт, звязаны са зменай ранейшага складу жыцця, паступова знікне і ўсё ўсталюецца. Абавязкова трэба пазнаёміць падлетка з правіламі гігіены палавых органаў.

12-14 гадоў. Калі ўзнікаюць пытанні на тэму сексу, трэба на іх адказваць. Дзіця павінна ведаць, што можа прыйсці да вас з любой праблемай. Адказваць жа лепей па-ранейшаму «невялікімі дозамі», без асаблівых дэталяў. Неабходна адказна падысці да раскрыцця тэмы кантрацэпцыі, хоць бы з дапамогай спецыяльных брашур.

14-16 гадоў. Псіхолагі мяркуюць, што ніхто, акрамя бацькоў і іншых значных дарослых, не можа пераканаць падлетка не пачынаць палавое жыццё надта рана. Сын павінен усвядоміць неабходнасць паважлівага стаўлення да жаданняў і пачуццяў іншых, што нельга прымушаць да ўступлення ў інтымныя адносіны. Дачка павінна ўмець сказаць процілегламу полу: «Надыдзе дзень, калі і я буду гатовая». Пры гэтым варта глядзець на жыццё рэальна і нагадваць падлеткам аб неабходнасці мець пры сабе прэзерватыў.

Пасля 16 гадоў размовы на тэму сексу паміж дзецьмі і бацькамі звычайна адбываюцца толькі пры ўмове вельмі вялікага даверу і адкрытасці. Неабходна зрабіць так, каб у падлетка не знікла жаданне дзяліцца надзеямі, чаканнямі, страхамі. Будзьце зацікаўленымі і давайце зразумець, што гатовы прыйсці на дапамогу, калі гэта спатрэбіцца.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

БЕЛИНВЕСТБАНК
BELINVESTBANK

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1июля 2013 г.

Наименование банка ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		877 706,9	926 785,9
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		5 587,5	3 714,8
4	Средства в Национальном банке	1103		1 840 302,0	1 630 854,5
5	Средства в банках	1104		1 029 068,5	757 536,4
6	Ценные бумаги	1105		1 692 814,6	1 045 351,9
7	Кредиты клиентам	1106		13 392 729,0	10 587 249,7
8	Производные финансовые активы	1107		699 597,4	651 338,1
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		34 260,6	18 062,5
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		1 252 336,4	924 603,2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		4 601,7	4 423,9
12	Прочие активы	1111		176 501,8	213 675,6
13	**ИТОГО активы**	**11**		**21 005 506,4**	**16 763 596,5**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		377 186,7	374 205,3
16	Средства банков	1202		2 206 153,5	1 974 024,9
17	Средства клиентов	1203		14 496 370,0	11 037 825,1
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		1 443 290,5	1 459 473,0
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
20	Прочие обязательства	1206		271 067,2	179 557,5
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**18 794 067,9**	**15 025 085,8**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		567 408,4	567 408,4
24	Эмиссионный доход	1212		0,1	0,1
25	Резервный фонд	1213		90 277,9	52 588,4
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		920 909,9	661 813,8
27	Накопленная прибыль	1215		632 842,2	456 700,0
28	**ВСЕГО капитал**	**121**		**2 211 438,5**	**1 738 510,7**
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**21 005 506,4**	**16 763 596,5**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2013 года

Наименование банка ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 326 146,7	1 357 135,0
2	Процентные расходы	2012		951 436,9	1 107 823,9
3	Чистые процентные доходы	201		374 709,8	249 311,1
4	Комиссионные доходы	2021		291 206,2	212 036,9
5	Комиссионные расходы	2022		55 161,3	38 523,1
6	Чистые комиссионные доходы	202		236 044,9	173 513,8
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		514,2	1 415,4
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		1 429,8	8,3
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		64 072,2	73 443,4
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(4 485,2)	1 017,0
11	Чистые отчисления в резервы	207		40 122,4	13 232,4
12	Прочие доходы	208		53 121,9	55 254,1
13	Операционные расходы	209		429 327,0	333 932,7
14	Прочие расходы	210		66 401,2	49 400,6
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		189 557,0	157 397,4
16	Налог на прибыль	212		18 384,3	22 841,0
17	**Прибыль (убыток)**	**2**		**171 172,7**	**134 556,4**

Председатель Правления **А.А. Лысюк**

Главный бухгалтер **А.Н. Сырокваш**

Ссылка на квартал.отчет:
http://www.belinvestbank.by/bank-profile/key_performance_indicators/nsfo/quarterly_report_belinvestbank/quarterly_balance_belinvestbank.php

www.belinvestbank.by

146 КОНТАКТ-ЦЕНТР

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»
220002, г. Минск, пр. Машерова, 29
УНП 807000028 Лицензия на осуществление банковской деятельности
Национального банка Республики Беларусь №3 от 03.06.2013